✓**22 лютага** ў галерэі «Лабірынт» Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адкрылася выстава **«Фестываль пейзажа»**, прысвечаная 150-годдзю з дня нараджэння класіка беларускага пейзажнага жывапісу Вітольда Бялыніцкага-Бірулі. Яе экспазіцыя – сапраўднае падарожжа па прасторах беларускай прыроды. Выдатныя краявіды, выкананыя ў традыцыйнай манеры, напаўняюць прастору галерэі адчуваннем сонца, холаду, снегу, марознага паветра. «Фестываль пейзажа» прадстаўляе новыя імёны мастакоў, знаёміць гледачоў з сучасным беларускім мастацтвам, распавядае аб традыцыях і вынаходках светаўспрымання беларускіх аўтараў-пейзажыстаў, і, канечне, аддае даніну пашаны В. Бялыніцкаму-Бірулі, які стварыў цэлую галерэю вобразаў беларускай прыроды.

Выстава будзе доўжыцца да 24 красавіка.